ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
“ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА АСІПОВІЦКАГА РАЁНА”

# МЯЖЭННАЯ
# Ніна Піменаўна

*бібліяграфічны нарыс*



У часы Вялікай Айчыннай вайны супраць гітлераўскіх акупантаў дзейнічала цэлая армія хлопчыкаў і дзяўчынак, якія аказалі супраціўленне ворагу. Толькі ў акупаванай Беларусі не менш 74,5 тысяч хлапчукоў і дзяўчынак, юнакоў і дзяўчат ваявалі ў партызанскіх атрадах. У Вялікай Савецкай Энцыклапедыі напісана, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны больш за 35 тыс. піянераў – юных абаронцаў Радзімы – было ўзнагароджана баявымі ордэнамі і медалямі. Гэта было дзіўны «рух»! Хлапчукі і дзяўчынкі не чакалі, пакуль іх «прызавуць» дарослыя, – пачалі дзейнічаць з першых дзён акупацыі. Рызыкавалі смяротна! Гэтак жа і многія іншыя пачыналі дзейнічаць на свой страх і рызыку. Нехта знаходзіў раскіданыя з самалётаў улёткі і распаўсюджваў іх у сваім райцэнтры або вёсцы. Іншыя шукалі зброю, патроны, гранаты і перадавалі іх партызанам. Кожны дапамагаў Радзіме змагацца з ворагам як мог.

У паўночнай частцы Асіповіцкага раёна ў асяроддзі ляснога масіва знаходзіцца вёска Градзянка. Зямля гэтая ў канцы XIX – пачатку XX ст. належала роду Завішаў. Назва па ўсёй бачнасці адбылося ад старажытнарускага слова град (паселішча, горад). Перад вайной у мястэчку меліся сямігадовая школа, клуб, магазін, аптэка, склад «Заготзярно», ларок «Заготсыр'ё», леспрамгас, лесапільны завод «Спартак». Па нядзелях у цэнтры пасёлка іграў духавы аркестр, з Лапіч прыязджалі на танцы афіцэры.

Летам 1941 года пасёлак быў акупаваны нямецкімі войскамі. Старастам стаў былы начальнік пошты Мухін. Але жыхары пасёлка не здаваліся. У ваколіцах Градзянкі дыслацыраваўся 210-ы партызанскі атрад імя І. В. Сталіна, затым 1-я Асіповіцкая партызанская брыгада імя Сталіна пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза М. П. Каралёва. У сакавіку 1942 года партызаны напалі на нямецкі гарнізон, які стаяў каля Градзянкі. У адказ карнікі спалілі пасёлак і знішчылі 350 мірных жыхароў. Фашысты спалілі і вёскі Макаўе і Палядкі, якія знаходзіліся побач. У пасёлку фашысты арганізавалі гета: у бараках ў чыгуначнай станцыі сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва Градзянкі. 4 сакавіка 1942 года іх усіх адвялі на градзянскія могілкі і расстралялі. Паводле матэрыялаў Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў ў той дзень было расстраляна 149 яўрэяў — жыхароў пасёлка. У кнізе «Памяць»

Асіповіцкага раёна (Мінск, БЕЛТА, 2002, с. 378–384) прыведзены спіс загінуўшых партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў Градзянкі. У памяць аб загінуўшых на брацкіх магілах пасля вайны ўсталяваны помнікі. На тэрыторыі Градзянскага сельсавета налічваецца 20 помнікаў. У 1975 годзе каля Градзянкі адкрыты мемарыяльны комплекс.

У спісе загінуўшых ёсць імя юнай удзельніцы партызанскага руху НІНЫ ПІМЕНАЎНЫ МЯЖЭННАЙ. Нарадзілася юная патрыётка 7 лютага 1926 года ў вёсцы Цімкавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Жыла і вучылася ў в. Градзянка, скончыла сем класаў. «Ніна радавалася ўсяму жывому, – з пяшчотай і цеплынёй паглядзеўшы на малую, успомніла старая настаўніца Марыя Іванаўна Бойка сваю былую вучаніцу Ніну Мяжэнную. – І ў сям'і, і ў школе, і ў коле сяброўак-аднакласніц была дзяўчынка заўсёды вясёлай, бойкай, дапытлівай».



Перад вачамі паўстаў вобраз Ніны – невысокага роста, але заўсёды падцягнутай дзяўчынкі з вялікімі блакітна-шэрымі вачыма, у якіх іскрылася нейкае пастаяннае здзіўленне. Ніна не толькі выдатна вучылася, але і актыўна ўдзельнічала ў гуртку мастацкай самадзейнасці. З-за гэтага яе захаплення некаторыя наракалі дзяўчынцы прывабны лёс артысткі, але сама Мяжэнная ўжо з пятага класа цвёрда вырашыла стаць лекарам і таму з нецярпеннем чакала таго часу, калі скончацца школьныя гады і можна будзе ехаць на вучобу ў медыцынскі інстытут.

Але не наканавана было спраўдзіцца яе мары. Фашысты з'явіліся ў Градзянцы ўжо праз два тыдні пасля пачатку вайны, а разам з імі прыйшлі гора і жах. Фашысты жорстка расправіліся з параненымі байцамі шпіталя, які знаходзіўся ў будынку школы, і якіх Ніна беражліва даглядала. Невялікую колькасць параненых ёй удалося выратаваць, адправіўшы ў лес. Акупанты стралялі па мірным жыхарам, спалілі шмат дамоў, зламалі ўсю мэблю ў

будынках школы і медпункта, абрабавалі краму. Гледзячы на злачынства ворагаў, дзяўчынка дала сабе слова усімі сіламі змагацца супраць захопнікаў.

Пры дапамозе сваёй настаўніцы – Бойка Марыі Іванаўны – Ніна стала сувязной партызанскага атрада №210.Дзяўчынка разам з дарослымі выконвала важныя даручэнні камандавання атрада займалася арганізацыяй ваеннага шпіталя ў вёсцы, збірала зброю, распаўсюджвала лістоўкі. Шмат разоў яна хадзіла ў Асіповічы, адкуль прыносіла каштоўныя звесткі аб дзейнасці ворагаў, медыкаменты, тытунь. У жніўні 1942 года нямецкае камандаванне кінула на знішчэнне партызанскага атрада цэлую дывізію. Ворагі былі ўпэўненыя ў поспеху, бо добра ведалі, дзе ў градзянскіх лясах хаваўся лагер народных мсціўцаў. Але мясцовыя падпольшчыкі паслалі Ніну папярэдзіць атрад аб небяспецы. Трывожная вестка паспела своечасова, і калі немцы акружылі лагер, ён ужо даўно быў пусты.

Вайна, на жаль, складаецца не толькі з перамог. Яе штодзённая рэчаіснасць – смерць, якая ўвесь час побач. І ніхто не ведае, на каго трапіць кашчавы палец у наступнае імгненне. Знайшоўся здраднік, які неўзабаве пасля той няўдалай аперацыі немцаў выдаў Ніну гестапа.



Прыгожым жнівеньскім вечарам дзяўчыну арыштавалі. Спачатку яе адвезлі ў Свіслач, потым у Асіповічы. Пачаліся допыты. Гестапаўцы ўмелі ламаць волю чалавека, яны добра ведалі, дзе праходзіць мяжа болю, якую проста немагчыма пераадолець. Ніне выбілі вока, выламалі рукі і ногі, рэзалі, калолі, палілі цела. Але яна маўчала. Знемоглую ад катаванняў, паўжывую, але непераможную дзяўчыну фашысты расстралялі ў кастрычніку 1942 года ў вёсцы Цяплухі. Пахавана Ніна ў брацкай магіле ў г. Асіповічы. Пасля вайны імем юнай гераіні была названа адна з вуліц Градзянкі.

## Літаратура

Кандрусевич, А. Увезли девочку в гестапо : [о Нине Меженной, семикласснице Гродзянской средней школы, патриотке] // Кандрусевич, А. Юные герои Могилевщины : очерки : для среднего школьного возраста. — Минск, 1994. — С. 148—152.

Меженная Нина Пименовна // Их именами названы... : энциклопедический справочник. — Минск : БелСЭ, 1987. — С. 414.

Загінуўшыя партызаны, падпольшчыкі, мірныя жыхары // Памяць. Асіповіцкі раён. — Мінск, 2002. — С. 382.

Меженная Нина Пименовна // will-remember [Электронный ресурс] : сайт. — Режим доступа: http://will-remember.ru.